# СЛЕД ВАЙНЫ

**Бойка Алег Аляксандравіч, Рэспубліка Беларусь**
*Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь,*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кансультант – к.ф.н. дацэнт Капцюг І.У.*

Анатацыя. У артыкуле прадстаўлены ваенны шлях Васіля Бойкі. Даследаванне адлюстроўвае ўзровень ведаў маладога пакалення аб ваенным мінулым продкаў.
*Ключавыя словы: вайна, лёс, маладое пакаленне, трагедыя, смерць.*

Мы жывём на зямлі, на якой ў гады Вялікай Айчыннай вайны загінуў кожны чацвёрты беларус. Жорсткая праўда і трагедыя вайны і сёння адзываецца болем у сэрцах. Гэтая тэма знайшла сваё адлюстраванне ў творчасці многіх пісьменнікаў: Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Івана Навуменкі і інш.

Што мы сёння ведаем пра вайну? Вайна – жахлівы рэнтген, які прасвечвае чалавека да душы, правярае асобу на чалавечнасць. З’ява, калі гінуць не толькі салдаты, але і ні ў чым не павіннае мірнае насельніцтва (безабаронныя дзеці, жанчыны, старыя), калі руйнуюцца гарады і вёскі, знішчаюцца не толькі матэрыяльныя, але і маральныя каштоўнасці, калі чалавек забівае падобнага на сябе. Менавіта такой бязлітаснай і разбуральнай была вайна і працяглая акупацыя на Беларусі. Беларускі народ мужна змагаўся супраць захопнікаў. Сярод іх і мой дзед Бойка Васіль Маркавіч.

Дзед даў жыццё майму бацьку. На жаль, дзед пакінуў гэты свет якраз, як я нарадзіўся. Ён жыў у вёсцы Ізабелін Кобрынскага раёна. Пра яго жыццё я ведаю толькі з размоў родных, сямейных фатаздымкаў. Калі пачалася вайна, дзеду быў 21 год. Пачынаў ваенны шлях у 1943 годзе ў партызанскім атрадзе імя Флягонтава. Па чырвонаармейскай кніжцы мы прасачылі шлях дзеда ад прыняцця прысягі да дэмабілізацыі 20.06.1946 года. Удзельнічаў у вызваленні многіх беларускіх гарадоў і вёсак. Сярод іх і мой раённы цэнтр – горад Кобрын.

З кнігі «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна»: «Раніцай 20 ліпеня 1944 года ў Кобрыне заціх бой, з укрыццяў сталі выходзіць людзі. Іх было не так многа, як хацелася бачыць у гэты радасны дзень. Страшныя дні і ночы перажыў Кобрын, захоплены гітлераўцамі ў ліку першых і вызвалены ў ліку апошніх беларускіх гарадоў» [1, с. 56].

Пасля вызвалення г. Кобрына ваеннае падраздзяленне, у якім быў мой дзед, злучылася з Чырвонай Арміяй каля ракі Прыпяць на тэрыторыі Украіны. Потым вызвалялі гарады на тэрыторыі Польшчы. «Узялі» г. Бяла-Падляску, г. Седлец. У гэтых баях быў паранены (сляпое асколачнае раненне), што таксама адзначана ў кніжцы чырвонаармейца. Ляжаў у шпіталі. Баі ішлі жорсткія, параненых было многа. На адным ложку дзеду прыйшлося ляжаць яшчэ з адным параненым салдатам – Громам Мікалаем Пятровічам. Пры размове высветлілася, што яны землякі. Гром Мікалай родам з вёскі Ліпава, што каля Дзівіна. Пасля вайны і да апошніх сваіх дзён жыў у вёсцы Хідры. Быў Героем Сацыялістычнай працы, меў

узнагароды. Былыя салдаты,сустракаючыся пасля вайны, часта ўспаміналі тыя страшныя часы. А самае дарагое свята – 9 мая – адзначалі разам.

Пасля шпіталю дзед ўдзельнічаў у вызваленні Германіі. Перамогу сустрэў у Берліне. У пацверджанне ёсць узнагароды дзеда. Але ваенны шлях на гэтым не закончыўся. Пасля перамогі служыў у Аўстрыі. Дамоў вярнуўся у 1946 годзе. Да апошніх дзён насіў асколак, які пабаяліся даставаць, бо знаходзіўся блізка каля сэрца. Дажыў да васьмідзесяці гадоў.

Не могу не ўспомніць і пра роднага брата майго дзеда Бойка Мікалая Маркавіча, якога за дапамогу партызанам (ён вёз зброю ў абозе) немцы павесілі ў вёсцы Руховічы. Як маўклівы сведак гісторыі, яшчэ расце тое дрэва каля крамы гэтай вёскі. Яго імя ўвекавечана на помніку салдатам, якія вызвалялі наш край і загінулі. Помнік устаноўлены ў вёсцы Хідры.

У кнізе «Памяць» сярод многіх імёнаў партызан, падпольшчыкаў, воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі і якія засталіся жывымі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, мы знайшлі звесткі пра майго дзеда.

З мэтай высветліць, у якой ступені маладое пакаленне ведае пра ваеннае мінулае сваіх родных, было праведзена анкетаванне сярод курсантаў трэцяга курса Ваеннай акадэміі (50 курсантаў).

Адказ на пытанне, калі была Вялікая Айчыная вайна, ведаюць усе курсанты.

Наступнае пытанне: ці прымалі ўдзел вашы родныя ці блізкія ў ВАв? Адказ: прымалі ўдзел у 37 чалавек з 50.

Трэцяе пытанне: хто такія партызаны? Вось адказы некаторых курсантаў: «Гэта людзі, якія прабіраліся ў тыл ворага і здабывалі важную інфармацыю», «Гэта людзі, якія не ўваходзілі ў армію, але самі змагаліся з фашыстамі», «Звычайныя людзі, якія збіраліся ў групы і вялі вайну супраць немцаў», «Гэта тыя, хто не служылі ў Чырвонай Арміі, але ваявалі за Радзіму».

Пры адказе на чацвёртае пытанне «Хто ведае ваенны шлях сваіх родных?» атрымалі наступныя адказы: а) былі ў партызанах: 15 чалавек; б) служылі ў Чырвонай Арміі: 29 чалавек, з іх дайшлі да Берліна – 6, былі ў канцлагеры – 3; в) не ведаю: 6.

На пытанні: «Як памяць пра мінулае ўплывае на наша сучаснае жыццё? Чаму мы павінны памятаць пра вайну?» атрымалі такія адказы: «Людзі павінны цаніць жыццё таму, што шчаслівыя светлыя дні нам дасталіся крываваю цаной»; «Кожны чалавек павінен ведаць, што здарылася, і павінен зразумець, што гэтага нам больш не трэба»; «Мінулае дае магчымасць нам задумацца над цяперашнім»; «Без гэтай памяці мы не будзем моцнай нацыяй. Ды і ведаць мінулае – гэта вельмі цікава»; «Я ўдзячны ўсім дюдзям, якія ваявалі за нашу краіну. Дзякуючы ім, мы зараз жывём пад мірным небам»; «Заўсёды трэба памятаць пра вайну і расказваць сваім дзецям»; «Трэба ведаць сваю гісторыю»; «Таму што мае родныя былі на вайне і выжылі. Яны далі жыццё маім бацькам»; «Без памяці пра мінулае не будзе будучыні»; «Я адчуваю павагу і гонар за сваіх продкаў».

Я лічу, што памяць пра мінулае здольна паўплываць на сучаснае, што ўсім нам трэба задумацца аб будучыні нашай краіны. Што будзе з краінай, калі



Репозиторий БГПУ

маладое пакаленне забываецца на яе гістарычную спадчыну і перастае цікавіцца не толькі гісторыяй сваей краіны, але і гісторыяй сваёй сям’і? Мы рызыкуем паўтарыць памылкі нашых продкаў. Наша Перамога вартая таго, каб ёй ганарыліся не толькі мы, але і нашы нашчадкі, людзі на ўсёй планеце, таму што гэта агульная Перамога ўсіх народаў над фашызмам. Памяць аб ёй не павінна служыць сродкам разладу ні ў нашай краіне, ні за мяжой. Наадварот, яна прызначана яднаць людзей на шляху да лепшай будучыні. На тое вельмі спадзяваліся ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

9 мая адзначаецца беларусамі як свята асабістае, сямейнае і дзяржаўнае. Памяць аб усіх, хто не вярнуўся з фронту, хто загінуў, абараняючы зямлю сваіх бацькоў, свяшчэнна. Не будзе такой памяці – не будзе і дзяржавы.

### Літаратура

1. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна // Гал. рэд. Г. К. Кісялёў. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – 624 с.
2. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. // Т. 2. Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1996. – 480 с.

## THE TRAIL OF WAR

**Boyko Oleg Alexandrovich, Republic of Belarus**
*The Military Academy of the Republic of Belarus*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor – PhD, Assistant Professor Kaptsiuh I.V.*

Abstract. The article presents the military way of Boyko Vasyl. The research reveals the level of knowledge of the young generation about military past of their ancestors.
*Keywords: war, destiny, young generation, tragedy, death.*